# Праводзіцца збор пажаданняў па пытаннях існуючай практыкі і прапаноў па ўдасканаленні мер адміністрацыйнай адказнасці

Распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 снежня 2019 г. № 247рп для падрыхтоўкі комплексных прапаноў па карэкціроўцы Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях створана міжведамасная экспертная камісія пад кіраўніцтвам Намесніка Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Чупрыс Вольгі Іванаўны.

У склад названай камісіі ўвайшлі работнікі Вярхоўнага і Канстытуцыйнага судоў, Генеральнай пракуратуры, Камітэта дзяржаўнага кантролю, міністэрстваў юстыцыі, унутраных спраў, па падатках і зборах, іншых ведамстваў, прадстаўнікі Парламента, а таксама навуковай супольнасці.

У рамках працы камісіі ажыццяўляецца вывучэнне як меркаванняў дзяржаўных органаў і арганізацый, упаўнаважаных складаць пратаколы і разглядаць справы аб адміністрацыйных правапарушэннях, альбо тых, якія з'яўляюцца рэгулятарамі адпаведных грамадскіх адносін, так і грамадзян, і суб'ектаў гаспадарання.

Збор пажаданняў па пытаннях існуючай практыкі і прапаноў па ўдасканаленні мер адміністрацыйнай адказнасці, а таксама прыкладаў і жыццёвых сітуацый, якія іх ілюструюць, ажыццяўляецца Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі.

Сабраныя матэрыялы будуць прааналізаваны і выкарыстаны пры падрыхтоўцы новага заканадаўчага акта.

Прапановы можна накіроўваць да 24 студзеня 2020 г.:

- у выглядзе паведамленняў у спецыяльнай тэме на Прававым форуме Беларусі;
- у пісьмовым выглядзе на паштовы адрас НЦПІ ;
- па электроннай пошце